# МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ЗАПАТРАБАВАЎ ПАСКОРЫЦЬ РЭКАНСТРУКЦЫЮ ЛЬНОЗАВОДАЎ

**Адпаведную задачу ён паставіў учора на пасяджэнні прэзідыума Саўміна, дзе разглядаліся пытанні развіцця галіны.**

Кіраўнік урада адзначыў, што льногаліна забяспечана сёння неабходнымі тэхналогіямі, спецыялістамі, сартамі культур. «Вядома, ёсць яшчэ пытанні па механізаванай уборцы і цярабленні лёну, па ўдасканаленні гэтай тэхнікі. Мінпрам і НАН займаюцца гэтымі пытаннямі. Маглі б і актыўней займацца, але ў прынцыпе тут зрухі рэальныя», — сказаў ён.

Вялікая работа вядзецца па рэканструкцыі Аршанскага льнокамбіната. Кіраўніком дзяржавы прыняты шэраг рашэнняў, якія забяспечваюць фінансаванне гэтага праекта, ёсць адпаведныя бізнэс-планы, работы вядуцца ў запланаваным графіку. «А вось прамежкавае звяно — перапрацоўка льнотрасты ў ільновалакно — знаходзіцца ў вельмі нездавальняючым стане, — канстатаваў прэм'ер-міністр. — Тая інфармацыя, якая ў нас ёсць, сведчыць аб безадказным стаўленні большасці аблвыканкамаў і Мінсельгасхарча да рэканструкцыі дзеючых ільнозаводаў».

Міхаіл Мясніковіч нагадаў аб тым, што ў выніку рэканструкцыі льнозаводы павінны быць аснашчаны сучаснымі лініямі па перапрацоўцы льнотрасты. «На жаль, мы вымушаны сабраць пасяджэнне прэзідыума Саўміна, каб звярнуць увагу аблвыканкамаў і Мінсельгасхарча на вельмі нездавальняючыя тэмпы работ», — заявіў ён. І гэта з улікам таго, што на рэканструкцыю і тэхперааснашчэнне такіх аб'ектаў знойдзены льготныя крэдытныя рэсурсы ў аб'ёме Br574 млрд. Гэта немалыя грошы, але ў некаторых абласцях і на асобных заводах да гэтага часу няма праектна-каштарыснай дакументацыі, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. «Інакш як безадказным стаўленнем гэта назваць нельга, — сказаў ён. — Я прасіў бы менавіта пад такім пунктам гледжання разгледзець гэта пытанне, і ў першую чаргу па ацэнцы дзейнасці кадраў як у цэнтры, так і на месцах».

Як паведаміў журналістам намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Паўлоўскі, усяго ў Беларусі 44 ільнозаводы. На іх дзейнічае 64 лініі па перапрацоўцы доўгага льновалакна і 65 — па перапрацоўцы кароткага. «Больш за 20 працэнтаў ліній па доўгім валакне і больш за 60 працэнтаў па кароткім за тэрмінам амартызацыі, г.зн. выкарыстоўваюцца 20 і больш гадоў пры тэрмінах амартызацыі 9 гадоў», — расказаў намеснік міністра. Прэзідэнтам дадзена даручэнне на працягу гэтай пяцігодкі пераасnасціць галіну, каб выйсці на вытворчасць ільновалакна 60 тыс. тон у год. Для гэтага ўкараняецца сучасная тэхніка. Выдзелены сродкі на тэхперааснашчэнне і новае будаўніцтва 11 ільнозаводаў, з іх 3 павінны пабудаваць і 8 тэхпераўзброіць. Трэба будзе паскорыць работу па падрыхтоўцы праектна-каштарыснай дакументацыі, самога будаўніцтва, а таксама пастаўку абсталявання на гэтыя аб'екты.

**БЕЛТА.**

Источник: "Звязда" - 2012-07-20